ПРОЛЕТАРЫ УСІХ КРАЁЎ ЗЛУЧАЙЦЕСЯ!

ЧЫРВОНАЯ ЗЬМЕНА

№ 35 (1002) | АЎТОРАК, 11-га лютага 1930 г.

ШТОДЗЁННАЯ ГАЗЭТА РАБОЧА-СЯЛЯНСКАЙ МОЛАДЗІ
Орган ЦК і Менскага АК ЛКСМБ
УМОВЫ ПАДПІСКІ:
1 месяц . . . 30 кап.
3 месяцы . . . 90 „
6 месяцаў . . . 1 р. 80 „
1 год . . . . 3 р. 30 „
АДРАС РЭДАКЦЫІ:
Менск, вул. Карла Маркса, 38
Тэлефоны: рэдактара—7-25, сэкратарыят—12-19.
АДРАС КАНТОРЫ:
Комсамольская 25, тэлеф. № 903.
ГОД ВЫДАНЬНЯ IX.

ПРЫВЕСЬЦІ У БАЯВУЮ ГАТОЎНАСЬЦЬ УВЕСЬ КОМСАМОЛ

Буйнейшая задача комсамолу—гэта перавесьці мэтады і формы працы і масавай работы гарадзкіх прадпрыемстваў у колгасы

ГАЛОЎНАЕ ЗАРАЗ—ГЭТА РАБОТА СЯРОД БАТРАЦТВА І БЕДНАТЫ, ДАПАМОГА ПРОЛЕТАРСКАГА ГОРАДУ СПРАВЕ СУЦЭЛЬНАЙ КОЛЕКТЫВІЗАЦЫІ І ЛІКВІДАЦЫІ КУЛАЦТВА, ЯК КЛЯСЫ

(Даклад сэкратара ЦК УсеЛКСМ тав. Салтанава)

МАСКВА, 9. На нарадзе крайкомаў, аблкомаў і некаторых акркомаў УсеЛКСМ, якая адбылася гэтымі днямі у ЦК УсеЛКСМ, сакратар ЦК УсеЛКСМ тав. Салтанаў зрабіў даклад аб рабоце комсамолу ў вёсцы ў сувязі з суцэльнай колектывізацыяй і ліквідацыяй кулацтва, як клясы.

Тав. Салтанаў перасьцярагае комсамол ад трох памылак, якія маюць месца ў розных організацыях.

Папершае, у шэрагу месц ліквідацыя кулацтва, як клясы, падмяняецца поўным раскулачваньнем і выключна адміністрацыйнымі захадамі.

У другіх організацыях адносяцца благадушна да кулака і ня прыкмячаюць хітрых манэўраў кулака, ня бачаць, напрыклад, як кулакі з вёскі бягуць у горад і імкнуцца ператварыцца ў рабочых. Нарэшце, бывае, што ў барацьбе супроць кулацтва кранаюць серадняка.

Наша задача—гэта прывесьці ў баявую гатоўнасьць увесь комсамол і накіраваць яго энэргію на ажыцьцяўленьне задач партыі, колектывізацыі сельскай гаспадаркі, і аб ліквідацыі кулацтва, як клясы ў раёнах суцэльнай колектывізацыі. Пры гэтым неабходна арыентаваць комсамол на непазьбежныя абвастрэньні клясавай барацьбы, бо кулацтва, як кляса без барацьбы ня ліквідуецца.

Для таго, каб комсамол мог аказваць сапраўдную дапамогу партыі, ён павінен дабіцца пераважнага ўплыву батрацтва і беднаты ў комсамоле. Буйнейшая задача комсамолу —гэта перанесьці мэтады і формы працы і масавай работы гарадзкіх прадпрыемстваў у колгасы. Гэты вопыт павінны перанесьці жывыя людзі.

Мы вырашылі мобілізаваць 100 адказных работнікаў комсамолу (у тым ліку шэраг членаў ЦК УсеЛКСМ, членаў бюро і сэкратарыяту Маскоўскага, Ленінградзкага і інш. камітэтаў комсамолу) на два месяцы для работы ў раёнах суцэльнай колектывізацыі.

Ня менш важная задача—гэта барацьба супроць опортуністычных тэорый. У той час, калі мы ставім сабе задачу—ліквідацыю кулацтва, як клясы, некаторыя задаюць пытаньне, а што рабіць з маладым кулаком?


Такія клопаты аб маладым кулаку замест работы сярод батрацтва і беднаты—опортунізм чысьцейшай вады. Бо-ж мы не клапаціліся аб сынкох капіталістых, калі ў 1917 годзе ліквідавалі ўсю капіталістычную клясу.

Галоўнае зараз—гэта работа сярод батрацтва і беднаты, дапамога пролетарскага гораду справе суцэльнай колектывізацыі.

Пасьля дакладу тав. Салтанава з паўтарагадзінным дакладам аб практычных задачах комсамолу ў сувязі з суцэльнай колектывізацыяй і ліквідацыяй кулацтва, як клясы ў раёнах суцэльнай колектывізацыі выступіў сакратар ЦК УсеКП(б) тав. Кагановіч.

Атака цьвердалобых

Ангельскія консэрватары ізноў выступілі ў парляманце з шэрагам пытаньняў, накіраваных супроць СССР. Консэрватыўны друк безадкладна пачаў чарговую кампанію. (З газэт).



Пераход на бесперапынку

ІНФОРМАЦЫЙНАЕ ПАВЕДАМЛЕНЬНЕ

9-га лютага адбылося аб'яднанае пасяджэньне Бюро ЦК КП(б)Б і прэзыдыуму ЦКК КП(б)Б.

Аб'яднанае пасяджэньне разгледзела пытаньне аб становішчы ў Гомельскай організацыі ў сувязі з фактамі зажыму самакрытыкі і парушэньня ўнутры - партыйнай дэмократыі, якія выяўлены абсьледваньнем ЦКК.

На пасяджэньні Бюро ЦК ад 5-га лютага па дакладу ЦКК была дадзена вычэрпальная політычная ацэнка фактам зажыму самакрытыкі і парушэньняў унутры партыйнай дэмократыі, якія выяўлены абсьледваньнем ЦКК.

Аб'яднанае пасяджэньне Бюро ЦК і прэзыдыуму ЦКК КП(б)Б аднагалосна адзначыла, што спершапачатку кіраўніцтва Гомельскай організацыі недастаткова прызнала свае памылкі і ў сувязі з гэтым недастаткова хутка арыентавала організацыю на барацьбу з зажымам самакрытыкі і парушэньнем унутрыпартыйнай дэмократыі, меўшым месца ў Гомельскай організацыі,

У далейшым (6-га лютага) Бюро Гомельскага акругкому поўнасьцю прызнала свае памылкі, згодна тэй ацэнкі, якая была дадзена ў рашэньнях ЦКК ад 18-І і Бюро ЦК ад 5-га лютага.

Аб'яднанае пасяджэньне Бюро ЦК і прэзыдыуму ЦКК дало дырэктыву мобілізаваць Гомельскую організацыю на далейшае разгортваньне барацьбы з зажымам самакрытыкі і парушэньнямі ўнутрыпартыйнай дэмократыі, а таксама дало паказаньні газэце „Полесская Правда“ аб рашучым ажыцьцяўленьні, пад кіраўніцтвам партыйных органаў, тых задач, якія высунуты рашэньнямі ЦК і ЦКК КП(б)Б перад партыйнай організацыяй Гомельшчыны.

Аб'яднанае пасяджэньне Быро ЦК і прэзыдыуму ЦКК, улічваючы становішча, якое стварылася ў Гомельскай організацыі, пастанавіла задаволіць просьбу т. МАЛАКОВІЧА і аслабаніць яго ад абавязкаў сэкратара Гомельскага акругкому КП(б)Б, адклікаўшы яго пад загад ЦК КП(б)Б.

10-га лютага 1930 г.

Весткі з Францыі

Узмацніць барацьбу за масы

„Важнейшай задачай парыскай організацыі зьяўляецца падрыхтоўка магутнай масавай політычнай забастоўкі 1 мая“

ПАРЫЖ, 10. На парыскай акруговай канфэрэнцыі компартыі агалошан ліст політбюро компартыі Францыі, у якім даецца ацэнка становішча парыскай організацыі і пералічваюцца яе бліжэйшыя задачы.

Адной з важнейшых задач парыскай організацыі політбюро лічыць **падрыхтоўку магутнай масавай політычнай забастоўкі 1 мая** і заклікае згрупаваць работу ў мэталёвай і хэмічнай прамысловасьці на правядзеньні ў жыцьцё наступных лёзунгаў: „Да 1 мая—ніводнага буйнага прадпрыемства без камітэту дзеяньня“, «стварэньне і ўзмацненьне профсэкцыйных сэкцый», «набор у парыскую організацыю 8 тысяч членаў“.

У ліку бліжэйшых задач парыскай організацыі ліст зазначае на падрыхтоўку да правядзеньня міжнароднага дню барацьбы з беспрацоўем, міжнароднага дню работніц і масавай дэманстрацыі ў памяць Парыскай комуны.

Політбюро заклікае парыскую організацыю, «перамогшы сабатаж опортуністых і фразёрства мніма-левых, па-бальшавіцку ўзяцца за масавую работу.

Ганебны выпад супроць СССР

БЭРЛІН, 9. Гаворачы аб судовым прыгаворы па справе фактычна апраўданых грузінскіх белагвардзейцаў і нямецкіх фашыстых, якія падрабілі савецкія чырвонцы, „Ротэ Фанэ“ зазначае, што ПРЫГАВОР ЗЬЯЎЛЯЕЦЦА АБВЯШЧЭНЬНЕМ ВАЙНЫ САВЕЦКАМУ СЛЮЗУ.

БЭРЛІН, 9. Лева - пролетарская „Бэрлін ам Моргэн“ піша, што апраўдальны прыгавор падробшчыкам не зьяўляецца нечаканым. Ужо ў працягу некалькі тыдняў у Нямеччыне разгортваецца концэнтраванае цкаваньне супроць СССР, якое разгортваецца агульным фронтам, пачынаючы ад агэнтаў Дэтэрдынга праз усіх начальнікаў поліцыі і рэдактароў буржуазных газэт Эўропы аж да шпіёнскіх штаб-кватэр.

СССР і Грэцыя

АФІНЫ, 9. Парлямант прыняў у першым чытаньні гандлёвы дагавор паміж СССР і Грэцыяй.

Чаму кіпіць кроў у Балдуіна...

„Уся кроў кіпіць у маім целе, калі я чытаю водзывы савецкага друку аб рабочым уралзе“.

(З прамовы Балдуіна ў палаце вобшчын).



Балдуіну, як і бушуючаму мору, для супакою патрэбна нафта...

Мобілізаваць масы на генэральную праверку дзейнасьці саветаў

(Да справаздачна-перавыбарчай кампаніі саветаў)

У пастанове ЦК КП(б)Б гаворыцца, што: „партыйныя організацыі і фракцыі АВК і РВК павінны зрабіць усё неабходнае, каб кампаніяй былі сапраўды ахоплены пагалоўна ўсе працоўныя масы. Пры шырока разгорнутай пролетарскай дэмократыі, падпарадкаваўшы шырокай пролетарскай крытыцы і самакрытыцы ўсю работу саветаў з пункту погляду таго, як выконвалася саветамі генэральная лінія партыі ў галіне соцыялістычнай рэконструкцыі гаспадаркі, наколькі былі ўцягнуты ў работу саветаў працоўныя масы, трэба, каб праверка работы і справаздачнасьць саветаў набылі характар масавага генэральнага агляду дзейнасьці іх“.

Крытыка і самакрытыка зьяўляецца неабходным мэтадам усяе работы. Разгортваньне яе ў час справаздачна-перавыбарчай кампаніі саветаў ёсьць органічная частка ўсёй работы. Комсамольскія і партыйныя організацыі, якія ня зробяць усяго неабходнага для забесьпячэньня разгортваньня пролетарскай самакрытыкі, бязумоўна, дапусьцяць вялікія політычныя памылкі, а памылкі гэтыя будуць на руку клясавым ворагам.

Толькі пры ўмове самакрытыкі будзе магчыма ўсебакова праверыць кожны сельсавет, кожнага члена паасобку і поўнасьцю выкарыстаць правы абіральнікаў у адкліканьні „тых членаў сельсаветаў, якія выкрыўлялі клясавую лінію, пасыўна адносіліся да колгаснага будаўніцтва і клясавай барацьбы, што навокал яго разгортваецца, і выступаюць супроць колектывізацыі“ (з пастановы бюро ЦК КП(б)Б).

Усё гэта ад партыйных, комсамольскіх і грамадзкіх організацый вымагае шырокай падрыхтоўчай работы і ў пастанове ЦК КП(б)Б па гэтаму пытаньню гаворыцца: „неабходна паўсюды правесьці самую шырокую падрыхтоўчую працу сярод батрацтва і бядняцка-серадняцкіх мас вёскі і колгасьнікаў, шляхам абгаварэньня пытаньняў, зьвязаных з перавыбарамі сельскіх саветаў і асобных членаў саветаў, проэктаў наказаў, кандыдатур у саветы і г. д., на сходах батрацтва і беднаты, на паседжаньнях бядняцка-батрацкіх груп, на дэлегацкіх сходах, на сходах колгасьнікаў і г. д.“.

Ва ўсёй падрыхтоўчай рабоце неабходна зьвярнуць большую ўвагу на работу сярод батрацкіх і бядняцкіх жаночых мас. „Актыўнасьць працоўных жанчын, якая значна ўзьнялася ў мінулую перавыбарчую кампанію, яшчэ больш павінна быць павялічана і яшчэ больш неабходна пашырыць уцягненьне працоўных жанчын у выбарныя органы саветаў“. (З пастановы бюро ЦК КП(б)Б).

Ва ўсёй падрыхтоўчай справаздачнай і перавыбарчай кампаніі саветаў нельга ні ў якім разе ня ўлічваць і нацыянальных момантаў.

Ва ўмовах Беларусі, пры наяўнасьці складанага нацыянальнага пераплёту, гэты момант павінен быць асабліва ўлічаны. Неабходна забясьпечыць правільнае ажыцьцяўленьне політыкі партыі ў нацыянальным пытаньні. Неабходна правесьці шырокую падрыхтоўчую работу сярод батрацкіх, бядняцка-серадняцкіх мас нацыянальных меншасьцяй, растлумачваючы ім клясавую сутнасьць нацыянальнага пытаньня.

Трэба сказаць, што на руку клясавым ворагам граюць беларускія нацыянал-дэмократы. „Тэорыя самабытнасьці“, сьціраньне клясавай барацьбы, простыя ці ўскосныя спробы рабіць паклёп на лінію партыі адбіваюць думкі і жаданьні клясавых ворагаў. Таму пры ўмовах абвостранай клясавай барацьбы, праводзячы выразную Ленінскую лінію ў нацыянальным пытаньні і ў часе перавыбараў, трэба наносіць руйнуючы ўдар па клясавому ворагу і па яго агэнтах, контррэволюцыйнаму беларускаму нацыянал-дэмократызму, не паслабляючы барацьбы з шовінізмамі ўсіх колераў.

Разам з гэтым трэба праверыць, як саветы на справе па-бальшавіцку праводзілі правільную лінію ў нацыянальным пытаньні і як абстаўлена работа саветаў нацыянальных меншасьцяй.

Усе організацыі павінны забясьпечыць неабходныя ўмовы для падбору асабовага складу саветаў. Трэба, каб усе кандыдатуры, вылучаныя ў савет, былі абгавораны партыйнымі організацыямі бядняцка-батрацкімі групамі, сходамі беднаты“. Неабходна забясьпечыць актыўны ўдзел у абгаварэньні і адстойваньні кандыдатур партыйных ячэек з боку кожнага комуністага і актыўнага падтрыманьня з боку комсамольцаў“. (З пастановы бюро ЦК КП(б)Б).

Трэба дамагчыся абавязковага выкананьня пастановы бюро ЦК КП(б)Б аб складзе выбарчых камісій, дзе гаворыцца: „парторганізацыі ў першую чаргу, а таксама і профсаюзы, у прыватнасьці саюз СГЛР, комсамол, жаночыя дэлегацкія сходы і КСУ, якія непасрэдна дэлегуюць сваіх прадстаўнікоў і склад выбарчых камісій, павінны прыняць у іх утварэньні самы актыўны ўдзел і забясьпечыць пераважна рабочы і батрацка бядняцкі працаздольны склад выбарчых камісій. Асаблівая ўвага выбарчых камісій павінна быць зьвернута на забесьпячэньне правільнага складаньня сьпісаў абіральнікаў і выяўленьне асоб, пазбаўленых выбарчага права“. Разам з гэтым партыйныя організацыі павінны сконцэнтраваць выключную ўвагу на складаньне політычных і практычных частак наказаў з тым, каб яны зьявіліся сапраўды політычнымі дакумантамі ў рабоце саветаў па ажыцьцяўленьні задач соцыялістычнай рэконструкцыі сельскай гаспадаркі, ліквідацыі кулацтва, як клясы.

П—ў.

ЗАСТАЛОСЯ 9 ДЗЕН. МАРУДЗІЦЬ—ЗЛАЧЫННА!

СУПРОЦЬПАСТАВІМ КУЛАЦКІМ МАНЭЎРАМ АБАГУЛЕНЬНЕ СРОДКАЎ ВЫТВОРЧАСЬЦІ І НАСЕНФОНДАЎ

Працант абагуленьня ў сярэднім 36—на апошнім мейсцы Мазырская і Менская акругі

Рашуча ажыцьцяўляць лінію партыі па ліквідацыі кулацтва, як клясы

Дзевяць рашаючых дзён

Стварэньне насенных фондаў, абагуленая ссыпка ў колгасах маюць выключна важнае політычнае значэньне яшчэ і таму, што з-за гэтага мы маем рашаючую схватку з кулацтвам. Яно імкнецца сарваць абагульненьне насеньня з тым, каб калгаскія палі засталіся не засеянымі.

Нярэдка наглядаецца, што калгасьнікі пад упартай кулацкай „агітпропработай“ разбазарваюць насеньне. Мы маем і такія раёны, дзе млыны завалены яравым насеньнем, яно перамалваецца на муку. Гэта мае месца толькі таму, што частка мясцовых комсамольскіх і партыйных організацый да гэтага часу не распачалі яшчэ працы па правядзеньню веснавой пасеўкампаніі.

Пры рашучай клясавай барацьбе пустога месца не павінна быць. Там, дзе спазьняемся мы,—пасьпявае кулак.

Весткі, атрыманыя з акруг БССР, гавораць аб тым, што становішча з абагульненьнем насеньня на 1 лютага мала чым палепшылася ў параўнаньні з апошнімі 10 днямі.

Па ўсіх акругах стварэньне абагуленых насенных фондаў выканана на **32,7 проц.** Усяго абагулена **50.914,4 тон.** Па асобных акругах таксама значнае недавыкананьне. Па Менскай акрузе абагулена насеньня **2887,7 тон** (*23,2* проц.), па Гомельскай акрузе—**7.808 тон** (33,8 проц.), па Мазырскай акрузе—*8804* тон (*21,4* проц.), па Бабруйскай—5390,1 (31,*5* проц.) па Віцебскай — *4897,5* тон (*40,2* проц.), па Полацкай — 2586,3 (38 проц.), Аршанскай—5571,9 (45,7 проц.) і па Магілеўскай—12974 тон (42,4 проц.).

На апошнім месцы па абагуленьні насеньня стаяць Менская і Мазырская акругі.

Паказаныя лічбы гавораць аб тым, што плян па абагульненьні насеньня выконваўся павольна і з нерашучасьцю.

Патрэбна зараз-жа паставіць пытаньне па парадак дня, а таксама рашуча здымаць некаторых працаўнікоў з працы за нядбайныя адносіны да выкананьня дырэктыў ураду і партыі.

Да 20 лютага засталося толькі 9 дзён. Вялікае значэньне мае ня толькі дзень, але каштоўна і кожная гадзіна. Насеньне—рашучае пытаньне ў падрыхтоўцы да сяўбы. Сюды павінны быць кінуты ўсе сілы. Мы павінны атрымаць рашучую перамогу, забясьпечыўшы гэтым самым магутны рост колектывізацыі і ліквідацыю кулацтва, як клясы. **С.**

„НОС ВЫЦЯГНУЛІ—ХВОСТ УВЯЗ“


Няма ніводнай газэты, дзе-б ня высьвятлялася пытаньне аб пасеўкампаніі. Толькі, як відаць, гэта пытаньне ня цікавіць адміністрацыі ванненага заводу пры Дарагапаўскім сельсавеце (Бабруйшчына). Ванены завод выраблае 1000 га пудоў угнаеньня і тут жа на гэтым заводзе зьнішчаецца другое вельмі каштоўнае ўгнаеньне—попел.

Ніхто не зацікавіўся куды з заводу дзенецца попел. Маюцца тры печы і кожная з іх дае за сэзон у сярэднім 80 пудоў попелу, а за час працы павінны быць 240 пудоў. Але дзе-ж той попел? Адміністрацыя ня ведала куды дзець попелу і каб пазбавіцца ад яго сыпала ў лес, у ямы. Каго тут трэба абвінавачваць? Адпаведныя органы, зьвярнеце ўвагу

Ведаючы.

Савгасы Беларусі перад пасяўной кампаніяй

Савгас „Серп“ Менскай акругі ўжо падрыхтаваў усё насеньне да вясновай сяўбы. У сучасны момант савгас прыступіў да падрыхтоўкі сельскагаспадарчых машын.



НА ЗДЫМКУ: Падрыхтоўка да вясновай сяўбы савгаснага трактару.

На 90 проц.

У час правядзеньня дню колектывізацыі і ўраджаю ў 29 годзе пад кіраўніцтвам Дзярноўскай ячэйкі КП(б)Б (Мазыршчына), організаваны два колгасы, у якія ўвашло пераважна батрацка-бядняцкая і серадняцкая частка насельніцтва.

Кулакі ўвесь час імкнуліся сарваць суцэльную колектывізацыю Дзярноўскага сельсавету шляхам розлай брыдкай агітацыі. Казалі: „Ня ідзеце ў колектывы, бо там ізноў будзе паншчына“. Некаторая частка кулакоў зьвязалася з папом в. „Белая Сарока“—Нядбайнікам Я., які ўзяў пад свой уплыў сябра Дзярноўскага сельсавету Леоненка і праз яго вёў агітацыю супроць колгасу, палохаў пагрозай няўпэўненых і нясьмелых, кажучы: „Хутка колгасьніцкіх актывістых будуць вешаць“.

Але спроба пашкодзіць суцэльнай колектывізацыі кулацтву не ўдалася. Асноўная батрацка-бядняцкая і серадняцкая маса ўжо ўвашла ў колгас. На сёньняшні дзень сельсавет, які складаецца з 404 гаспадарак—колектывізаваны на 90 проц. Вядзецца праца па абагульваньню жывёлы, маемасьці колгасьнікаў і шпаркая падрыхтоўка да вясковай пасяўной кампаніі.

Тры подпісы.

БЯЗЬДЗЕЙНІЧАЮЦЬ

Вялікаборскі с-с, Касьцюковіцкага раёну да гэтага часу слаба падрыхтаваны да пасеўнай кампаніі. Няма ініцыятывы па правядзеньню мерапрыемстваў у гэтай галіне. Слаба ўдзельнічаюць у гэтай справе як сябры сельсавету, так і настаўніцтва.

Не вядзецца праца сярод бядняцка-серадняцкіх мас па растлумачэньню значнасьці пасеўнай кампаніі. Як трэба павышаць ураджайнасьць і пашыраць пасеўную плошчу і што гэта такое за штука аграмінімум, як яго трэба праводзіць у жыцьцё ў колектыўных гаспадарках—ніхто не растлумачыў сялянам ні з боку сельсавету, ні з боку настаўніцтва. Час не чакае. Сельсавет, настаўніцтва і ўсе мясцовыя сілы павінна ўзяцца за працу.

Арэшчынка.

Бярэце прыклад

У вёсцы Дукоры (Сьмілавіцкі раён) організаваўся колгас імя ЦВК БССР. Абраны савет колгасу распачаў працу па падрыхтоўцы да веснавой пасяўной кампаніі.

Сяляне ўсе, як адзін, ачысьцілі насеньне. Усяго аўсу ачышчана 1400 пудоў, ільнянога насеньня 75 пудоў, канюшыны 55 пудоў і шмат інш. насеньня. Жанчыны сабралі насеньне гародніны для поўнага забесьпячэньня гародаў колгасу.

Р. ГУЛО.

АДПОР КУЛАЦКАЙ ХЛУСЬНІ

Ва ўноў організаваным колгасе імя Сталіна (Самахвалавіцкі раён, Меншчына) на плошчы 200 гектараў шпаркім тэмпам ідзе абагульненьне. На сёньняшні дзень маем абагуленых 6000 пудоў яравога насеньня. Колгасьнікі рыхтуюцца да абагульненьня жывёлы. Ударным парадкам рамантуюць вялікія хлявы для жывёлы.

Кулаччо, бачачы ў абагульненьні сваю пагібель, рознымі чуткамі спрабуе затрымаць абагульненьне. Так, кулакі пусьцілі чуткі, што нібы то «у агульных хлявох жывёла пераб'е адна адну». „Ад абагуленае жывёлы малако ня будзе для колгасаўцаў, а ўсе пойдзе ў горад“.

Але бедныя і серадняк далі рашучы адпор кулацкай брахні. Ужо створаны ўдарныя брыгада на дапамозе савету колгасу ў абагульненьні.

В.

У барацьбе за суцэльную колектывізацыю і ліквідацыю кулацтва, як клясы

Пастанова ўраду „аб мерапрыемствах па ўмацненьню соцыялістычнай перабудовы сельскай гаспадаркі ў раёнах суцэльнай колектывізацыі і па барацьбе з кулацтвам“ прадстаўляе краёвым і абласным выканкомам права **ўжываць у раёнах суцэльнай колектывізацыі ўсе неабходныя захады барацьбы з кулацтвам аж да канфіскацыі іх маемасьці і высяленьня іх з асобных раёнаў і вобласьцей.**

Усе абставіны патрабуюць таго, каб раскулачваньне праводзілася з максымальнай шпаркасьцю, каб гэтым папярэдзіць магчымасьць самараскулачваньня кулакоў, пры якім яны палохаюцца, ператвараючы маемасьць у грошы і ўвозячы апошнія ў іншыя месцы. Такая шпаркасьць упаўне магчыма ў раёнах суцэльнай колектывізацыі, дзе па сутнасьці, раскулачваньне ўжо праводзіцца і дзе ўсё амаль падрыхтавана для таго, каб без асаблівых атрымак **мобілізаваць батрацка-бядняцкія і серадняцкія масы на канчатковую ліквідацыю кулацкіх гаспадарак.**

Тыя абставіны, што конфіскуемая кулацкая маёмасьць паступае у недзялімыя фонды колгасаў у якасьці ўзносаў беднякоў і батракоў, якія ўступаюць у колгасы, **павінна садзейнічаць стварэньню згуртаванага батрацка-бядняцкага ядра ў колгасах і стымуляваць іх прамы ўдзел у раскулачваньні.** Партыйныя, комсамольскія і шэфскія організацыі, усякім чынам садзейнічаючы стварэньню і ўзмацненьню батрацка-бядняцкіх груп, павінны карэктаваць работу гэтых груп так, каб яна сапраўды была накіравана супроць кулацтва, але ні ў якім выпадку ня супроць серадняка. Каб агарадзіць раскулачваньне ад вольных або мімавольных сказажэньняў **неабходна ствараць моцныя батрацка-бядняцкія групы ў сельскіх саветах і ў прасьцейшых колгасах, праводзіць пры дапамозе гэтых груп растлумачальную работу ў асяродзьдзі серадднякоў уцягваючы іх у правядзеньне раскулачваньня і ажыцьцяўляць гэта апошняе, абапіраючыся, такім чынам, на ўсю масу працоўнага насельніцтва вёскі.**

Раскулачваньне зьяўляецца і павінна быць складанай часткай масавай колектывізацыі. **У раёнах, дзе яшчэ не праводзіцца масавая колектывізацыя, усе нашы мерапрыемствы павінны насіць падрыхтоўчы характар да ліквідацыі кулацтва, як клясы.** Падатковая сыстэма, землябудаўніцтва, заданьні па загатоўках і наогул усе рычагі клясавай політыкі павінны быць прыведзены ў рух, каб падрыхтаваць у гэтых раёнах операцыі па канчатковай ліквідацыі кулацтва. **І на першым месцы самым важнейшым і самым моцным рычагом для гэтага будзе магутны рост колектывізацыі.**

Пастанова ўраду аб раскулачваньні павінна распаўсюджвацца на гэтыя раёны па меры сапраўднага разгортваньня масавай колектывізацыі ў іх. Але і акрамя гэтага, у тых выпадках, калі кулакі вядуць злосную агітацыю за ўбой, альбо масавы продаж жывёлы з мэтай падарваць матар'яльны стан колгасаў, яны, на падставе закону ад 16-га студзеня, ужо зараз высяляюцца за межы данага раёну, а іх сродкі вытворчасьці перадаюцца ў недзялімыя фонды колгасаў. **Такім чынам, нават у раёнах, дзе колектывізацыя яшчэ не прыняла суцэльнага характару, акрамя ўжыцьця суровых рэпрэсій дапускаецца раскулачваньне ў адносінах да тых кулакоў, якія актыўна шкодзяць колгаснаму будаўніцтву.**

Само сабою зразумела, што ў гэтых раёнах ні ў якім разе не павінна быць дапушчана самараскулачваньне і самаліквідацыя кулакоў. Трэба памятаць, што процэсы колектывізацыі шырацца не па днёх, а па гадзінах. Раёны у якіх сёньня яшчэ не праводзіцца пагалоўнае раскулачваньне кулакоў, заўтра **могуць прыступіць да масавай колектывізацыі, а значыцца і прамога раскулачваньня.** Трэба да гэтага рыхтавацца. Трэба ўзмацніць сельскія саветы пролетарскімі і паўпралетарскімі элемэнтамі, каб яны сталі сапраўднымі рычагамі колектывізацыі і правільнай клясавай політыкі. Трэба ствараць усюды і асабліва ў прасьцейшых колгасах **батрацка-бядняцкія групы, трэба зараней прыняць на вучот усе кулацкія гаспадаркі, недапускаючы іх самаліквідацыі.**

Конкрэтнай мэтавай устаноўкай, якой павінна быць суцэльная колектывізацыя ў магчыма больш кароткія тэрміны, і як вынік гэтага,—ліквідацыя кулацтва, як клясы.

У барацьбе супроць кулацтва мы атрымаем перамогу толькі ў тым выпадку, калі ня толькі разгорнем шырокую работу па суцэльнай колектывізацыі, але калі, разам з тым, будзем сыстэматычна і ўпарта пераводзіць колгасы на вышэйшую організацыйную і гаспадарчую ступень. Да політыкі ліквідацыі кулацтва, як клясы, мы прышлі таму, што стварылі ў асобе савгасаў і колгасаў дастатковую матар'яльную базу для гэтага. **Узмацненьне працоўнай дысцыпліны ў колгасах і савгасах, правільная організацыя працы, максымальнае скарыстаньне ўсіх сродкаў вытворчасьці, павышэньне продукцыйнасьці працы, узмацненьне аграмаджаных і асабліва недзялімых фондаў,—ўсе гэта будзе садзейнічаць узмацненьню той базы, якая дазваляе нам усё мацней і з большай пасьпяховасьцю ажыцьцяўляць політыку ліквідацыі кулацтва, як клясы.**

ТРЭБА СПЫНІЦЬ

Савгас Зазер'е (Сьмілавіцкі раён) і да гэтага часу перамолвае сялянскае яравое збожжа на муку і крупы. Несьвядомае сялянства ня толькі Сьмілавіцкага, але і іншых раёнаў завaліла млын збожжам. Дзеля таго, каб змалоць на муку ў млыне Зазер'е, трэба на цэлы месяц раней запісацца ў чаргу.

Абавязкова трэба спыніць перамол яравога збожжа і прыцягнуць да адказнасьці кіраўнікоў млыну.

Алесь.

АБ СЯЎБЕ ЗАБЫЛІСЯ

У вёсцы Лапічы, Варавіцкага раёну Гомельшчына партыйная і комсамольская ячэйкі, а таксама і сельсавет зусім ня рыхтуюцца да вясновай сяўбы. Дзякуючы гэтаму ў вёсках і пасёлках Лапіцкага сельсавету, які перайшоў на суцэльную колектывізацыю—не ачышчана а ні фунта насеньня.

Сяляне на сходах некалькі разоў ставілі пытаньне аб ачыстцы насеньня але сельсавет і партыйная ячэйка не зьвярнулі на гэта ўвагі. Актыву вёскі, а таксама сельсавету патрэбна скарэйшым тэмпам павесьці працу па падрыхтоўцы да веснавой сяўбы і па растлумачэньню значэньня надыходзячай пасеўнай кампаніі. для чаго неабходна ўцягнуць у працу аграномаў Варавіцкага раёну.

Раманаў Алесь.

Літаратурная старонка

Пятрусь Броўка

Наперад маладых!

Гады радзілі буры...
У стэп, у веліч гор
хадзілі мы пад штурмы
пад песенны віхор.

І ў сівярох паўночы
ярчэй гарэць агні;
а мы ўсё крочым, крочым
бяз меж і без граніц.

Мы ўсё падаравалі
за мэту за адну.
Гісторыі скрыжалі
пра гэта памянуць

Грымелі навальніцы—
У бойках юны полк,
Ня ўхленчылі мы ніцма
мой любы комсамол!

І калі клічуца буры,
калі завуць гады—
—Наперад, ўсе на штурмы!
—Наперад маладых!

Да новых, новых станцый,
таварыш, дай руку!

Умеем мы змагацца
бяз пораху і куль.

А там у сіні вечар,
дзе сьнег у абоймах зор
завеяныя клеці
чакаюць нас даўно.

Стаяць бабулі-хаты,
а золь іммжыць, іммжыць...
І быццам з па за кратаў
ня выйдуць з-за мяжы.

Там клічуць, клічуць стрэхі
бязьмежжамі дарог...
Таварышы па цэху!
на межы, у палёх!

А заўтра рана, рана
заводы на хаду
наказ нам адвітальны
гудкамі пададуць.

Бо калі клічуць буры,
калі завуць гады—
—Наперад, ўсе на штурмы!
—Наперад маладых!

АГНЯЦЬВЕТ

Песьні зімовыя

Захлынуўся ў ціхіх песьнях
сьнежань,
Загудзеў працяжна дравоў ка агод.
І наліўся звон увыш, да вежаў:
Засьнаваў іскрыста—полымны завод.

І панеслась песьня буйнае машыны;
Чую залівающца—зьвіняць гудкі...
І задумна шэпчуць казкі вер б'іны
Плачуць і плююць бары-маладнякі.

Да, ня плачце, песьні жыцьця,
маладыя,
Не шкадуйце кветак тых, што
адцьвілі
Услаўляйце сэрцы нашы агнявыя,
Што гараць у бурным, баявым агні.

Ня гудзі сярдзіта, србная бабуля,
Ня сумуй на скрыдлах ціхіх
забыцьця
Воркат твой зімовы, што зямлю
атуліў
Не заглушыць сьпеваў буйнага
жыцьця.

Ад комфракцыі сэкратарыяту Бел. асоцыяцыі пролет. пісьменьнікаў

За апошні час распаўсюдзіліся закулісныя чуткі аб тым, што ня домы грамадзкасьці контр-рэвалюцыйны верш „Пасеклі наш край" напісаны не А ДУДАРОМ адным, а ДУДАРОМ разам з АЛЕКСАНДРОВІЧАМ.

З прычы гэтага, тав. А. Александровічам падана заява ў комфракцыю БелАПП, якая ўстанавіла, што чуткі гэтыя пушчае, дзеля пэўнае мэты высланы з БССР сам А. ДУДАР.

ПАСТАНОВА КОМФРАКЦЫІ СЭКРАТАРЫЯТУ БелАПП

Абмеркаваўшы заяву тав. А. АЛЕКСАНДРОВІЧА і ўсе акалічнасьці справы, фракцыя КП(б)Б сэкратарыяту БелАПП адзначае, што ўсе падобныя чуткі зьяўляюцца нахабным шантажам з боку контррэволюцыйных элемэнтаў, досыць ужо прышчэмленых рукою дыктатуры пролетарыяту.

Гэтыя контр рэволюцыйныя элементы, бачачы ўсю немагчымасьць правядзеньня сваёй агіднай справы праз друк і публічныя выступленьні, выкарыстоўваюць цяпер старыя, заежджаны абывацельскі спосаб паклёпу на аднаго з лепшых пролетарскіх поэтаў А. АЛЕКСАНДРОВІЧА, які сваёю творчасьцю давёў, што ён аддана працуе на карысьць пролетарскае літаратуры. Гэтым самым яны прабуюць сьвядома зганьбіць усю пролетарскую літаратуру, супроць якое змагаліся, будучы яшчэ некалі ў пісьменьніцкіх і розных культурна-грамадзкіх арганізацыях.

Застрэльшчыкам у гэтай кампаніі злоснага паклёпу, як і трэба было чакаць, зьявіўся высланы з БССР за антысавецкі ўчынак (верш „Пасеклі наш край") контррэволюцыянэр А. ДУДАР (Т ГЛЫБОЦКІ) ён-жа А. ДАЙЛІДОВІЧ.

Комфракцыя БелАПП рашуча абвяргае ўсе гэтыя нікчэмныя спробы абясьсіліць моц пролетарскае літаратуры. У пэрыяд надзвычайна шпаркага росту социялістычных элемэнтаў выкарчоўваюцца да рэшты тыя кулацка-нэпманскія карэньні, з якіх выраслі некалі пышныя краскі контр рэвалюцыі, зьнішчаецца тая глеба, якая харчавала іх.

Але ў рашучы момант клясавага змаганьня пад ударамі нашага наступленьня, вораг хапаецца за ўсе магчымасьці абароны, за ўсе магчымасьці перашкоды пераможнаму руху социялізму. Паміраючае кулацтва організуе тэрорыстычныя акты над актывістымі-колгасьнікамі, селькорамі, комуністымі і комсамольцамі. Падобныя-ж спробы ў літаратуры робіць контррэволюцыянэр А Дудар, імкнучыся зганьбіць пролетарскага поэту тав. А. АЛЕКСАНДРОВІЧА.

Комфракцыя сэкратарыяту БелАПП заклікае пісьменьніцкую і ўсю пролетарскую грамадзкасьць даць як сьлед па руках контр-рэволюцыйным элемэнтам, якія ў сваім азьвярэньні зарываюцца надта далёка.

ФРАКЦЫЯ КП(б)Б СЭКРАТАРЫЯТУ БелАПП

50 ГОД ЛІТАРАТУРНАЙ ЧЫННАСЬЦІ



8-га лютага 1930 году споўнілася 50 год літаратурнай чыннасьці армянскага пісьменьніка Аляксандра Шырванзадэ.

Шырванзадэ радзіўся ў 1858 годзе ў г. Шамаха, які праз год пасьля нараджэньня пісьменьніка быў дашчэнту разбураны землятрасеньнем. Змалку будучы пісьменьнік пачынае служыць, каб пракарміцца.

З 1881 году творы яго пачынаюць друкавацца ў Тыфлісе ў газэце „Мшак" („Работнік") і зьвяртаюць на сябе ўвагу. Першым бэлетрыстычным творам Шырванзадэ было апавяданьне: «Пажар на нафтавым заводзе", зьяўленьне якога была адзначана крытыкай. З 1893 году ён канчаткова аддае сябе літаратурнай дзейнасьці. Ім напісана шмат драматычных твораў. Шматлікія творы пісьменьніка перакладзены на расійскую, французскую, ангельскую, румынскую, чэскую, цюркскую і грузінскую мовы.

У 1903 годзе Шырванзадэ выехаў у Парыж, дзе наведваў Сорбонну (аддзяленьне Парыскага Унівэрсытэту). У канцы 1910 году ён варочаецца на Каўказ і праз некалькі год адпраўляецца ў вялікае падарожжа. Ён наведаў Турцыю, Сырыю, Эгіпэт, Італію, Злучаныя Штаты. У 1926 годзе вярнууся ў Армэнію.

Шырванзадэ неаднакраць падлягаў ганеньню царскага ўраду, быў арыштаваны і высланы.

Уся Армэнія, а разам з ёю, грамадзкасьць і літаратурны сьвет Савецкага Саюзу 8 лютага 1930 году адзначае юбілей аўтара „Намуса".

НА ЗДЫМКУ: апошні партрэт А. Шырванзадэ.

І. СУБАЧ.

Пяцігодкі паход

У паходзе нячуваным
Песьню горда запяем
І напорам гураганным
Перашкоды разьнясём.

І тады ўзрастуць калёны
Фабрык дымных ў гарадох,
Ураджай залатазвонны
Забуяе на палёх.

Бурам лютым не сагнуць
нас—
Будзем радасьцю гарэць,
Наша творчая магутнасьць
Паланіла
Сілу рэк.

Будзем жыць на абкаванай
Стальлю звонкаю зямлі,
Будзем чуць
Ліхіх комбайнаў
Стогалосы пераклік...

Бурных будняў гул сталёвы!
Індустрыйны грохат—звон!
Як нічым,
Я зачарован
Будаўніцтвам новых дзён.

У паходзе нячуваным
Песьню горда запяём
І напорам гураганным
Перашкоды разьнясём.

СЯРГЕЙ ДАРОЖНЫ

Б'ецца ў шыбіны вецер

Алесю Гурло

Б'ецца ў шыбіны вецер паўночным
крылом
Б'ецца вецер халодны і сьцюжны,
Недзе песьню віюгі пяюць за сялом
Недзе скача мяцеліца,
Кружыць...

Можна ў хаце сядзець, ды такою-ж
парой
Пройдзе хто над дарогамі тымі?..
Сьвішча вецер халодны над хвояй
старой,
Сьвішча вецер у сьнежанскім дыме.

Сядзем, дружа! Згадаем пяройдзены шлях,
Дні юнацтва, пару маладасьці,
Як да болю закутая ў песьні душа
Гэтак шчыра сьпявала і проста.

Як цярпелі ў той час, як жылося
тады,
Як бацькі пашы гнулі галовы...
Ты раскажаш сягоньнячы нам маладым.
Як паданьне ў нязьведаных словах.

Хай успомніцца гэтая чорная сланк,
Як жылі, як згаралі дачасна,
Каб ярчэйшай цяпер наша радасьць
была—
Муляроў найвялікшага шчасьця.

. . . .
. . . .

Неяк ладна хрыпіць пад нагамі
мароз...
Слаўна санкі плывуць па дарозе
І поэт. ён умее змагацца за лёс.
Як салдат перад кожнай пагрозай.

Ён умее змагацца. на варце стаяць
Будаваць, бараніць ён умее.
Зложыць песьню і гэтую песьню
сьпяваць
Будуць ветры сьпяваць і завеі—

І калі абарвуцца налчас берагі,
Кожны зьменіць пяро на вінтоўку.
Стане той за гармату, на крэйсар
другі
Песьню, песьню сьпяем перад бойкай.

Зьмітро Сергяевіч

На каньках

Добра як! У сэрцы клёкат...
Месяц. Зоры. Срэбны лёд.
І на лёдзе хуткі й лёгкі
Я бягу. бы самаход.

На бягучае гурчэньне
На маўчаньне цішыні
Льлецца сіняе сьвяценьне
З цёмна-зорнай вышыні.

І ў праменьнях гострых, хуткіх
Між сьвінцова-шэрых хмар
Расьцьвітаюць незабудкі
Маіх песень, маіх мар.

Расьцьвітаюць і мігцяцца
І ляцяць на дол, уніз...
Ну і што-ж,—а мне імчацца
У маўклівай цішыні.

Сэрца п'янае бяз брагі...
Я—напруджаны імпэт.
Хуткалётныя зыгзагі
Рассыпаюць агняцьвет.

Гэта—мой па-нада мною,
Гэта—радасьці узьлёт
Гэта—жыцьце маладое
Пераехала на лёд.

Студзень 30 г.. Менск.



АБВШ У АГРАПАХОДЗЕ

Па тэлефону ад нашага спэцкорэспондэнта

КОЙДАНАВА, 9-ІІ. Учора, пачынаючы з 8 гадзін раніцы ў вёсках Макаўчыцы, Дзягільня, Баравая, Касілавічы, Вялікая Дзягільня і іншых вёсках ахопленых аграпаходам школы АБВШ, курсантамі праводзілася ўзмоцненая работа, у якой таксама прынялі ўдзел і колгасьнікі.

За два дні курсантамі праароблена вялізарная работа.

Брыгады па ачыстцы насеньня (90 чалавек) сумесна з 30 колгасьнікамі ачысьцілі і ссыпалі ў абагуленыя сьвірны 1500 ПУДОЎ НАСЕНЬНЯ.

48 курсантаў сталярна-плотніцкай брыгады, сумесна з 12 колгасьнікамі, зрабілі тры паказальныя дацкія кармушкі, 15 перагародак, абсталявалі тры абагуленых стайні, зрабілі 9 кармушак на 56 коняй, адрамантавалі два вазы, дзьверы ў хаце-чытальні і інш.

Кавальна-сьлясарныя брыгады адрамантавалі каля 70 плугоў, 40 барон, падкавалі 25 коняй.

Шорная брыгада адрамантавала 32 хамуты, 36 шлей, 9 вузьдзечак і інш. дробную збрую.

Вэтэрынарнай брыгадай агледжана больш 50 колгасных коняй зроблена прывіўка 30 сьвіньням і інш.

Брыгада па рабоце ТСА Авіяхіму правяла некалькі сходаў сялян, на якіх ставіліся пытаньні аб ролі ТСА-Авіяхіму ў часе вайны і пры мірным становішчы. У выніку гэтага завербавана 85 чалавек у шэрагі ТСА-Авіяхіму, з якіх 55 жанчын. У некаторых вёсках функцыянавалі стралковыя ціры, праз якія прапушчана было каля 200 чалавек.

У ВЁСЦЫ МАКАЎЧЫЦЫ АБСТАЛЯВАНА МЯСЦОВАЯ ШКОЛА.

Па пастанове сходаў беднаты і агульных сходаў сялян-колгасьнікаў вёсак суцэльнай колектывізацыі: МАКАЎЧЫЦЫ, ДЗЯГІЛЬНЯ, КАСІЛАВІЧЫ, І БАРАВОЙ РАСКУЛАЧАНА 13 КУЛАЦКІХ ГАСПАДАРАК І Ў ТЫМ ЛІКУ ПОП БАРАЎСКАЙ ЦАРКВЫ.

Акрамя гэтага, па пастанове агульных сходаў сялян колгасьнікаў вёсак Баравая і Дзягільня, ЗАЧЫНЕНЫ ДЗЬВЕ ЦАРКВЫ, ПАПЫ ГЭТЫХ ЦЭРКВАЎ БУДУЦЬ ВЫСЛАНЫ З ВЁСАК.

У вёсцы Дзягільня, па пастанове агульнага сходу колгасьнікаў, вычышчаны 6 чалавек чужых, якія пралезьлі ў колгас.

У ВЁСЦЫ ВАЛОЎНІКІ (ПУТЧЫНСКІ СЕЛЬСАВЕТ), ЯКАЯ ЗНАХОДЗІЦЦА АМАЛЬ ЛЯ САМАЙ МЯЖЫ, ОРГАНІЗАВАНЫ КОЛГАС, У ЯКІ ЎСТУПІЛА 14 ГАСПАДАРАК.

У часе аграпаходу былі выпушчаны дзьве шматтыражкі друкаванай газэты „Чырвоны Сьцяг", прысьвечаныя аграпаходу.

Райн аграпаходу.

Х. БАЦЬВІНІК.

Вялікі замежны паход лінкорӑ „Парыская Комуна“ і „Профінтэрн“

Пераможцы марской стыхіі

Гэроі лінкору „Парыская Комуна“ шлюць бальшавіцкае прывітаньне свайму шэфу—Ленінскаму комсамолу Беларусі

Маракі лінкору „Профінтэрн“ у гасьцях у Аляксея Максімавіча Горкага

ЛІСТ З САРДЫНІІ

Пасьля рамонту штормавых папсаваньняў наш атрад вышаў з Брэску для працягненьня свайго плаваньня і дасягненьня канчатковай мэты нашага паходу.

Трэба сказаць, што тыя вурокі, якія мы атрымалі ў Біскайскай затоцы, далі вялікую трэніроўку асабоваму складу і мы бязумоўна змаглі змагацца з любою воднай стыхіяй, але па іроніі лёсу на гэты раз нас некалькі сутак пакалыхала мёртвая зыб, ветру ня было, прычым карабель схіляла часам да 25 градусаў. Але асабовы склад ужо так прывык, што мы ў гэты час спакойна наладжвалі вечары самадзейнасьці і ня ўнізе, а на верхняй палубе, прычым удзельнікам прыходзілася трымацца за штормавыя леяры, каб не зваліцца за борт.

Некалькі слоў аб Брэсьце. Горад вайсковы. Накшталт нашага Кронштадту, але бязумоўна тып эўропейскага гораду і маса магазынаў.

На бераг нас так і ня пусьцілі, вя гледзячы на шэраг перагавораў прадстаўніцтва з француcкай уладай і прышлося быць толькі некаторым камандзірам па справах службы і пакупак. Дзіўнае ўражаньне і з другога боку вельмі цікава. **Трэба было-б раіць усім савецкім грамадзянам, час ад часу, пабываць за мяжой, каб не забываць таго, ад чаго мы пазбавіліся 12 г. таму назад.**

Ну хаця б па галіне вайсковых: **казыраньне салдат. сьледваньне дзяншчыкоў за афіцэрамі і г.д. На кожным вуглу полісмэны, якіх мы бачым зараз толькі ў кіно ў сьмяхотных палерынах і г. д.**

На нас глядзелі з вялікай зацікаўленасьцю, асабліва радавыя маракі. Нездарма таму супроць допуску нашай каманды на бераг. **было імення марское камандваньне.** І толькі пасьля настойлівасьці нашага прадстаўніцтва, Парыж дазволіў, але мясцовая ўлада адвяла для гэтай мэты асобную мясцовасьць, **без права наведваньня гораду, ад чаго мы бязумоўна далікатна адмовіліся і хутка пакінулі гэты негасьцепрыемны порт.**

Пасьляхова прайшлі Атлянтычны акіян, Гібралтарскую затоку, і зараз ужо стаім у Кальяры на высьпе Сардынія. Грузім вугаль, чысьцімся, а пасьля ў Нэаполь, дзе бязумоўна, нам будзе дазволен праход на бераг

Настрой каманды бадзёры, паходам усе задаволены, але, бязумоўна, па Савецкаму Саюзу засумавалі, і асабліва калі сустракалі ў Міжземным моры новы год, дык думкай **унесьліся ў сваю дарагую родную краіну, да сваіх блізкіх таварышоў, сяброў па рабоце і па агульнай справе—будаўніцтва соцыялізму.**

Зараз цяжка суміраваць усе свае ўражаньні, таму што заняты сваёй бягучай работай па спэцыяльнасьці. Але пасьля, на дарогу можна будзе **напісаць ня мала старонак, бо цікавага так шмат і асабліва ў галіне ўзаемаадносін з насельніцтвам, спосабаў і мэтадаў размоў з імі на пальцах і г. д.**

У наступным артыкуле пастараемся як найлепш апісаць уражаньне аб Італіі, і ў прыватнасьці аб Нэаполі,

Шчырае прывітаньне і лепшае пажаданьне ў новым годзе разьвіцьця нашаму шэфу—ленінскаму комсамолу Беларусі.

С. Чарнышэнка.

У Сорэнто ў Горкага

Сорэнто. Якар аддалы. На шлюпцы падходзім да берагу. З прупы, якая вышла нас спатыкаць, выходзіць грамадзянін.

— Вы, таварышы, да Горкага? гаворыць на чыстай расійскай мове.

— Так, мы к Аляксею Максімавічу.

— Добра, хадземце за мною.

У некалькіх кроках стаіць прыгожы аўтамабіль. Садзімся. На нас глядзяць два гвардзейцы „яго вялікасьці“, якіх у Італіі можна ўбачыць на кожным кроку.



Карта паходу

Аўтамабіль ляціць па гарыстай мясцовасьці, міма апэльсіных садоў. Дрэвы ад апэльсін здаюцца жоўтымі. Над абрывам красуюць цёмна-ружовыя розы.

Аўтамабіль пад'яжджае да невялікай вілы, якая стаіць у садзе асабняком. Наш праваднік—сын Аляксея Максімавіча, вядзе нас наверх. Увесь час ён гутарыць з намі, як быццам спаткаліся старыя знаёмыя.

Невялікі, просты мэбляваны пакой, Няма нічога прэтэндуючага на роскаш.

Насустрач выходзіць доктар, мастак і жонка Максіма Аляксеевіча (сына Горкага). Усе па-таварыску вітаюцца з намі. З суседняга пакою выходзіць і сам Аляксей Максімавіч. Высокая фігура згорблена хваробай, але на твары радасьць, светлая ухмылка.

— Добры дзень, таварышы!

Голас трохі грубы з націскам на о. Цёпла, па-таварыску з усімі вітаецца, моцна цісьне руку.

Такой цеплаты прыёму мы не чакалі. Усё надзвычайна проста—проста.

Перадаем запрашэньне асабовага складу наведаць караблі.

— Прыду, абавязкова прыду калі гэта будзе магчыма... У дрэннае надвор'е мяне з пакояў ня пускаюць,—гаворыць Аляксей Максімавіч, ківаючы на доктара і іншых.—**Пажыць-бы яшчэ хоць 5-6 гадоў, у гэты тэрмін можна скончыць намечаную работу.**

Завязалася жывая гутарка.

— **Гіне стары сьвет ня толькі Эўропы, але і Амэрыкі—самай багатай краіны. Чыкаго a анкроціўся, 6 мілёнаў беспрацоўных налічвае Амэрыка,** —гэта цікавы факт.

У асаблівасьці шмат гаворыць Аляксей Максімавіч аб будаўніцтве СССР і аб нашай пяцігодцы.

— **Вялікую справу творыць Савецкі Саюз, вельмі вялікую. Часам кават дзівішся, як сьмела бяруцца за работу людзі. Інжынэры не адважваюцца, а малапісьменныя рабочыя бяруцца. Прыкладаюць сваю здольнасьць і глядзіш—будуюць. Будуюць, чорт іх пабяры! Гэта-ж сіла! Ведаюць, што ўсё гэта іх, агульнае.**

Палаяўся толькі за тое, што недастаткова дзелімся вопытам.

— **Замежныя мовы вывучаеце?—пытае.**

— Вывучаем, але дрэнна.

— **Трэба вывучаць, прыгодзіцца, вельмі прыгодзіцца.**

Аб многім гаварыў Аляксей Максімавіч, кожнай дробязьзю цікавіўся. Расказаў нам аб жыцьці і аб быце італьлянцаў.

Зайшлі ў габінэт. Сьветлы пакой невялікіх разьмераў з выхадам на тэрасу, рабочы стол, шафы з кніжкамі, каля сьцяны за шырмай ложак, на сьцяне некалькі акварэльных карцін. Вось і ўсё, што ёсьць **у габінэце і спальні вялікага пісьменьніка.**

За абедам, за гутаркай няпрыкметна ляціць час.

Пасьля абеду спусьціліся ўніз.

Зараз мы, дарагія таварышы, завядзем грамафон. Доктар, настаўце «Буру на Волге».

Любімая пласьцінка Аляксея Максімавіча,—паведамляе з ухмылкай на твары нявестка Аляксея Максімавіча.

— **Я валжанін і люблю Волгу—гаворыць Горкі.**

Пры гуках песьні твар Горкага зьмяніўся, ён зрабіўся сьветлым, заззяў нейкай асаблівай радасьцю. Трэба было яго бачыць у гэтую хвіліну, каб зразумець, што ён перажывае. Адчувалася, што гукі захапляюць яго ўсяго. Некалькі раз ён імкнуўся штосьці сказаць, закурваў і тут-жа забываўся аб папяросе.

Разьвіталіся па-таварыску. Надвор'е зьмянілася. Яно пагоршала і Аляксею Максімавічу прышлося застацца ў сваіх пакоях. Але ўсё-ткі вышаў старык на тэрасу і мы доўга яшчэ бачылі яго постаць, адыходзячы ад вілы.

Ка стылёў.

(З фото-апаратам па Менску

У студзені г. г. працоўнымі Менску была наладжана дэмонстрацыя з лёзунгам „Чыгуначную царкву пад клюб“. Цяпер хадайніцтва працоўных задаволена. З царквы зьняты крыжы і павешаны чырвоныя сьцягі. Царква пераабсталёўваецца



НА ЗДЫМКУ: забраная царква.

З блёкноту фізкультурніка

— Група фізкультурнікаў у 20 чалавек, з заводу „Ільіч“ Быхаўскага раёну, зрабіла вылазку на лыжах у ваколічныя вёскі для скліканьня сялян на сход у завадзкі клюб. На сходзе стаяла пытаньне аб колектывізацыі. Была прынята пастанова організаваць колгас.

Зараз прыступілі да практычнай работы па організацыі колгасу.

Гэты пачын трэба падтрымаць другім фізкультурнікам.

В. Шэбашоў.

— У Барысаўскай профтэхшколе будаўнікоў аб фізкультурным выхаваньні вучняў ніхто ня думае, фізкультурнага гуртка няма.

Сабраныя яшчэ ў мінулым годзе сродкі ад суботніка на набыцьцё фізкультурных прыладаў комсамолец Уласевіч скарыстаў на другія „выдаткі“. Чамусьці бюро гэтага пытаньня не вырашае.

Г. Кугель.

— У м. Сьвіслач, Бабруйскай акругі маецца 2000 чалавек моладзі сярод якое па фізвыхаваньню нічога ня робіцца. Спачатку быў інструктар, але на працягу трох месяцаў яму не плацілі грошай, таму ён пакінуў усю работу і зараз гурткі не працуюць.

Лайко.

Паштовая скрынка

Яўсееву—„Зрывае працу“, Я. К.—„Усе-ж такі безабразія“, „Лёгкаму Кавалерысту“—„Самагоншчыкі не пакідаюць гнаць“, Цараву Н. — „НКА абараняе антысэміта“, Я. Захвацкаму —„Я п'ю, але злоўжываньня ня люблю“, Я. К. — „Што будзе далей“, Ц. А.—„У рэдакцыю газэты „Чырвоная Зьмена“, Воку — „Ня мейсца варожаму элемэнту ў працоўнай школе“, Баравому — „Скрыўленьне клясавай лініі Вузьдзенскім райсаветам“, Бедняку—„Расшыфроўка“, Ударнай брыгадзе БДВТ — „Ліст у рэдакцыю“, Сярдзюкову — „Аб дачцы былога абшарніка“. Пералічаныя допісы накіраваны ў адпаведныя організацыі для расьледваньня і прыняцьця належных мер.

Мандрыко—„Чыя тут справа“, Авле —„Праца „ЛК“ павінна стаць масавай, штодзённай працай“, № 81636—„Бяз клясавага чуцьця“, Валяр'янаву —„Ліст у рэдакцыю“, Жыгальскаму—„На чорную дошку“, Паляку Язэпу—„Несправядлівa“, і „Вось дык настаўнік“, Паляўнічаму — „Трэба чыстка“, Пацярпеўшаму—„Калі гэта скончыцца“, Мядзелеву — „Пісьмо“, Сабалю Рыгору—„Ліст у рэдакцыю“, Х. К.—„Заўсёды РК зачынен“, Маяковічу—„Аб Замбржыцкай і Глускай сямігодках“. Пералічаныя допісы ня пойдуць, па закранутых у іх пытаньнях зьвярнецеся да мясцовых організацый.

Аўтару — „Астаткі бюрократызму“, „Лёгкаму Кавалерысту“ — Вон такога настаўніка з савецкай працоўнай школы“, Каліне—„Яна ня можа служыць“, і „Трэба зьвярнуць увагу“, Антону Маладзенькаму—„Беспарадкі ў Крупскім нардоме“. Ваўчку—„У рэдакцыю газэты „Чырвоная Зьмена“, В. Гапшкову—„Воз і ныне там“, Юнкору—„Загадчык клюбу варожа адносіцца да дзяцей“, Байкусу Раскінду—„Зрываецца праца“. Пералічаныя допісы ня пойдуць, бо не набываюць грамадзкай цікавасьці, — выкарыстайце ў насьценнай газэце.

Ведаючаму—„У рэдакцыю „Чырвонай Зьмены“, „Лёгкаму Кавалерысту“—„Аб зембінскім саюзе будаўнікоў“, Бачыўшаму—„Аб Марына-Горскім с. г. тэхнікуме“, Бюро—„У рэдакцыю „Чырвонай Зьмены“, Група „Лёгкай Кавалерыі“—„Дакаціўся“. Пералічаныя допісы ня пойдуць, няма адрасоў, а ў некаторых і подпісаў.

Жылку Я М.—„Адказ на заметку ў „Чырвонай Зьмене“ № 19“, А. Шэйману—„Адказ на заметку: „Усю работу пад агонь самакрытыкі“—ня пойдуць, бо яны не даюць вычэрпваючых адказаў, патрэбных для абвяржэньня.

Лісоўскаму Язэпу — „Ліст у рэдакцыю“—па гэтаму пытаньню зьвярнецеся да ўпаўнаважанага па працы“.

Комсамольскі календар

МенАБ ЮП прапануе ўсім таварышам, вылучаным на курсы акцыбрацкіх работнікаў і павадырам атрадаў зьявіцца на заняткі курсаў 11 лютага а 7 гадзіне ўвечары.

Адказны рэдактар
Рэдколегія

Менск, друкарня БДВ. Галоўлітбел № 599